# ГРЫГАРЫЯНСКАЯ РЭФОРМА КАСЦЁЛА І ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІЯ ЗЕМЛІ

**А. К. Шымак**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, helenaszymak@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя падзеі, звязаныя з рэфармаваннем Касцёла падчас пантыфікату папы Грыгорыя VII (1073–1085). Асаблівая ўвага звяртаецца на дакумент пад назвай «Dictatus Papae», апублікаваны каля 1075 г. У сувязі са з’яўленнем гэтага збору кананічных правілаў кіеўскі князь Ізяслаў Яраславіч звяртаўся ў Рым і там спрабаваў вырашыць пытанне прыналежнасці кіеўскага прастола.

***Ключавыя словы:*** Грыгарыянская рэформа; Грыгорый VII; Dictatus Papae; Ізяслаў Яраславіч; трыумвірат Яраславічаў.

# ГРИГОРИАНСКАЯ РЕФОРМА ЦЕРКВИ И ВОСТОЧНОСЛАВЯНСКИЕ ЗЕМЛИ

**Е. К. Шимак**

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Республика Беларусь, helenaszymak@gmail.com*

В статье рассматриваются основные события, связанные с реформированием Церкви в период понтификата папы Григория VII (1073–1085). Особое внимание уделяется документу под названием «Dictatus Papae», изданному около 1075 г. В связи с появлением этого сборника канонических правил киевский князь Изяслав Ярославич обратился в Рим и там попытался решить вопрос о принадлежности киевского престола.

***Ключевые слова:*** Григорианская реформа; Григорий VII; Dictatus Papae; Изяслав Ярославич; триумвират Ярославичей.

# GREGORIAN CHURCH REFORM AND THE EASTERN SLAVIC LANDS

**A. K. Shimak**

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republic of Belarus, helenaszymak@gmail.com*

The article examines the main events related to the reform of the Church during the pontificate of Pope Gregory VII (1073–1085). Particular attention is paid to the document entitled “Dictatus Papae”, published around 1075. In connection with the appearance of this collection of canonical rules, the Kiev prince Izyaslav Yaroslavich appealed to Rome and there tried to resolve the issue of belonging to the Kyiv throne.

***Keywords:*** Gregorian reform; Gregory VII; Dictatus Papae; Izyaslav Yaroslavich; Triumvirate of the Yaroslavichi.

Рэформа Касцёла ў XI ст. дасягнула свайго піку падчас пантыфікату папы Грыгорыя VII (1073–1085). Ад імя гэтага пантыфіка яна і атрымала сваю назву. Рэформы былі выкліканыя ўнутранымі праблемамі Касцёла і працягнулі пераўтварэнні, якія распачаліся ў абацтве Клюні. Можна вылучыць некалькі этапаў ў гэтым працэсе: пачатак рэформы ад Клімента II (1046–1047) да Льва IX (1049–1054), рэформа выбараў папы Мікалая II (1059–1061), уключэнне пытання аб інвестытуры[1] ў праграму рэформаў, распаўсюджванне яе на шэраг краін пры Аляксандры II (1061–1073), змаганне за рэформы з імператарам пад кіраўніцтвам Грыгорыя VII, асабістае паражэнне папы, але перамога грыгарыянскіх ідэй [1, с. 69–72].

Шлях рэфармавання Касцёла быў няпростым і працяглым. З пантыфікатам Льва IX у Рымскім Касцёле наступіў доўгачаканы рэлігійны мір. Пасля яго смерці 16 ліпеня 1054 г. у Канстанцінопалі адбыўся раскол паміж папскімі легатамі і патрыярхам. Наступнікі на пасадзе св. Пятра, сутыкнуўшыся са стратай сувязяў з імператарам Усходу, імкнуліся ўмацаваць сувязі з імператарам Захаду. Сярод некалькіх папаў гэтага перыяду вялікім аўтарытэтам карыстаўся дыякан Гільдэбранд, які пазней стаў папам Грыгорыем VII. Пазнейшыя намаганні па рэфармаванні Касцёла таксама належаць яму. Ад імя папаў, яшчэ як легат, ён выязджаў ў асобныя біскупствы і краіны для арганізацыі там касцёльных сінодаў, якія мелі на мэце ліквідацыю з'явы сіманіі[2] і клерыкальнага канкубінату[3].

У 1059 г. на Латэране адбыўся сінод біскупаў, які вызначыў форму абрання папы. Вынікам сіноду стаў дэкрэт аб абранні папы рымскага, які таксама называюць Дэкрэтам папы Мікалая II (1058–1061). У сілу гэтага дакументу захоўвалася ранейшае права заходняга імператара зацвярджаць папу, які павінен быў выбірацца кардыналамі-біскупамі большасцю галасоў. Рымская арыстакратыя з часам страціла ўсякі ўплыў на выбары папы. Яшчэ адна адметнасць Дэкрэта заключалася ў тым, што папа мог быць правамоцна абраны па-за межамі Рыма, калі гэта было зроблена большасцю біскупаў. Папа Аляксандр II (1061–1073) спрыяў умацаванню сувязей паміж Рымам і біскупамі Захаду. Каб арганізаваць там касцёльныя сіноды, ён накіраваў сваіх легатаў у хрысціянскія краіны. Падтрымліваў кантакты са свецкімі кіраўнікамі.

Пік царкоўнай рэформы прыйшоўся на пантыфікат Грыгорыя VII (1073–1085), які ў якасці дыякана Гільдэбранда доўгі час быў дарадцам папярэдніх

---

[1] Інвестытура — уручэнне біскупскіх адзнакаў (мітры, пастарала, пектарала, пярсцёнка, піускі).

[2] Сіманія — продаж і купля касцёльных пасадаў.

[3] Канкубінат — трывалая сувязь паміж мужчынам і жанчынай, непацверджаная заключэннем сужэнскага саюзу.

папаў. Ён быў італьянцам па паходжанні. З маладых гадоў знаходзіўся ў Рыме. Тут атрымаў адукацыю пад наглядам свайго дзядзькі, абата Авентынскага манастыра, і пасля вучобы, верагодна, стаў манахам у Клюні. У 1049 г. папа Леў IX, бачачы яго незвычайныя здольнасці, прызначыў Гільдэбранда скарбнікам і архідыяканам Рымскага касцёла і абатам бенедыктынскага кляштара св. Паўла ў Рыме.

22 красавіка 1073 г. Гільдэбранд быў аднагалосна абраны папам як кардыналамі-біскупамі, так і рымскім народам. Першым значным крокам Грыгорыя VII было скліканне Латэранскага Сінода адразу пасля яго абрання ў 1074 г. Падчас сустрэчы была зноў асуджана сіманія і катэгарычна забаронена цэлебрацыя святой Імшы жанатымі святарамі. Латэранскія сіноды стануць рэгулярнымі падчас пантыфікату Грыгорыя VII.

Эпахальнай справай пантыфікату Грыгорыя VII стаў дакумент пад назвай Dictatus Papae, апублікаваны каля 1075 г. Гэта быў звод кананічных правіл, якія вызначалі праграму будучага пантыфікату Грыгорыя VII. Пераемнікі Грыгорыя VII будуць імкнуцца да рэалізацыі гэтых пастановаў. У дакуменце з вялікім акцэнтам падкрэслівалася бясспрэчнае права папы кіраваць паўсюдным Касцёлам. Адзін з прынцыпаў абвяшчаў тое, пра што раней нельга было нават уявіць: папу дазволена звяргаць імператараў, прысуд папы ніхто не можа адмяніць, ён сам можа адмяніць прысуд любога. Дакумент грунтаваўся на дагматычнай праўдзе аб папскай беспамылковасці: Рымскі Касцёл ніколі не памыляўся і, паводле сведчання Святога Пісання, ніколі не памыляецца [2, с. 322; 3].

Здавалася б, пытанне ўнутраных рэформаў Рымска-каталіцкага Касцёла не мае дачынення да Усходняй Еўропы, а менавіта да Кіеўскай Русі. У гістарыяграфіі замацаваўся погляд на гэтыя тэрыторыі, як на землі, дзе традыцыйна пераважае хрысціянства ва ўсходнім яго варыянце. Кантакты з папствам падаваліся як эпізадычныя, а даследчыкі ў перыяд СССР, наогул, імкнуліся надаць гэтым нешматлікім адносінам захопніцкі характар з боку Рыма [4]. Але, адыходзячы ад такога вузкага бачання праблемы, трэба заўважыць, што характар знешнепалітычнай дзейнасці князёў Кіеўскай Русі быў не абмежаваны формуламі прыналежнасці ці «исконности». На першае месца выступалі прагматычныя інтарэсы. У XI ст. як раз і адбыўся такі эпізод, які сведчыць менавіта пра перавагу асабістага над ідэалагічным.

У гэты ж час на ўсходнеславянскіх землях распачынаецца працэс палітычнай раздробленнасці Кіеўскай Русі. Пасля смерці Яраслава Мудрага яго сыны кіравалі асобнымі землямі. Ізяслаў валодаў Кіевам і Ноўгарадам, Чарнігаў атрымаў Святаслаў, Пераяслаў адышоў да Усевалада.

Пасля смерці Ігара і Вячаслава іх землі разам з Уладзімірам Валынскім і Смаленскам былі падзеленыя паміж старэйшымі братамі. Такім чынам склаўся трыумвірат Яраславічаў — Ізяслава, Святаслава і Усевалада.

Кожны з членаў трыумвірата імкнуўся пашырыць асабістыя ўладанні. Ізяслаў у 1057 г. захапіў большую частку Валынскай зямлі. У сакавіку 1067 г. Яраславічы разбілі полацкага князя на рацэ Нямізе. Усяслаў Брачыславіч быў схоплены і зняволены ў Кіеве. Летам 1068 г. у бітве на рацэ Альце на Пераяслаўшчыне полаўцы разбілі войска Ізяслава, Святаслава і Усевалада. Калі Ізяслаў вярнуўся ў Кіеў, апалчэнцы, якія ўцяклі з поля бітвы, пачалі патрабаваць ад яго коней і зброю, каб зноў змагацца з ворагам. Адмова прывяла да паўстання. Ізяслаў уцёк у Польшчу, а кіеўскі народ абраў сваім князем вызваленага з вязніцы Усяслава. Вясной 1069 г. польскае войска на чале з князем Баляславам II Смелым ўвайшло ў Кіеў і пасадзіла Ізяслава на кіеўскі пасад.

Падзеі 1068–1069 гг. парушылі адзінства трыумвірата Яраславічаў. Вясной 1073 г. Святаслаў пры падтрымцы Усевалада выгнаў Ізяслава з Кіева. Ён ізноў збег у Польшчу, але Баляслаў II не аказаў яму дапамогі, а заключыў мір са Святаславам. Не атрымаўшы жаданай падтрымкі, у 1075 г. Ізяслаў прыбыў да двара імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Генрыха IV. Імператар прыняў ад яго падарункі і абяцаў прымірыць са Святаславам. Але і гэта спроба не мела поспеху [5, с. 528–537].

Дарэмна паспрабаваўшы знайсці патрымку ў Баляслава II і Генрыха IV, Ізяслаў звярнуўся да папы рымскага. З гэтай мэтай у Рым быў накіраваны сын Ізяслава Яраполк. У сувязі з гэтымі падзеямі з’явіліся два дакументы — лісты папы Грыгорыя VII да Ізяслава і Баляслава II.

Папа звяртаўся да кіеўскага князя і называў яго каралём Русі, абяцаў апостальскае бласлаўленне (у дакуменце напісана Дзмітрый — хрысціянскае імя Ізяслава). З ліста вынікае, што сын Ізяслава прасіў каралеўства як дар св. Пятра з рук папы. Папа пісаў, што акажа падтрымку ў справядлівых рэчах. Да Ізяслава былі накіраваныя папскія паслы, каторыя на словах павінны былі ўдакладніць усе шчыгулы гэтай справы. Пантыфік заклікаў давяраць ім [6, с. 5–6].

Другі ліст, накіраваны да Баляслава, у першую чаргу звяртае ўвагу на ўнутраныя праблемы Касцёла ў Польшчы і дзейнасць мясцовых біскупаў. Што датычыцца Ізяслава, то на гэты конт папа пісаў, што справы, якія ён не ўзгадвае ў сваім лісце, будуць вырашаць яго паслы. І можна меркаваць, што гэтая неназваная справа і ёсць справа кіеўскага князя. У абодвух лістах папа піша пра сваіх паслоў, які на месцы павінны вырашаць пытанні [6, с. 7–8].

Азнаёміўшыся з вышэйузгаданымі лістамі, можна зрабіць выснову, што папа даволі асцярожны ў словах, ён не кажа наўпрост пра асаблівыя правы Ізяслава на кіеўскае княжэнне, але падкрэслівае пра падтрымку ў справядлівых рэчах. Гэтыя даволі нейтральныя папскія дакументы не маглі выклікаць якойсці буры. Магчыма, што выражэнні шацунку і падтрымкі, аказаныя Грыгорыем VII Ізяславу, прымусілі ўсё ж такі Баляслава II даць Ізяславу ваеннае суправаджэнне. З ім кіеўскі князь і вяртаецца ў свае землі. Але справа з заняццем кіеўскага трону вырашылася не дзякуючы папскаму дакументу, а збольшага збегам абставінаў. У 1076 г. Святаслаў памёр, а Усевалад вырашыў не змагацца з Ізяславам.

Сама сітуацыя з рымскімі перамовамі, ліставанні, абмен пасольствамі — усё гэта сведчыць пра тое, што кіеўскі князь сачыў за падзеямі міжнароднага жыцця і быў гатовы выкарыстаць іх у сваіх інтарэсах. Князь Ізяслаў папрасіў дапамогі менавіта тады, калі папа сваім знакамітым Dictatus Papae заявіў аб выключных правах рымскага пантыфіка.

Тыя падзеі, магчыма, не вельмі ўразілі іх сучаснікаў. Але такога нельга сказаць пра гісторыкаў XIX–XX стст. Яшчэ ў 1975 г. гісторыкі Н. Г. Ткачэнка і А. М. Рапаў вельмі ўважліва прааналізавалі папскія дакументы 1075 г., адрасаваныя Ізяславу і Баляславу II, звярнуўшы ўвагу на недакладнасці і хібы папярэдніх перакладаў. Іх грунтоўная праца нават прымушае пакінуць без крытыкі заўвагі пра «экспансионистскую политику папства» [7]. Апошняя праца, якая была прысвечана вышэйузгаданым падзеям, належыць сучаснаму ўкраінскаму гісторыку В. Ідзьо. У 2018 г. з’явілася невялікая брашура пад назвай «Святий Папа Римський Григорій VII — засновник Королівства Руси-України в XI столітті». Можна сказаць, што ў гэтай працы прадстаўлена, свайго роду, абагульненне інфармацыі пра перамовы Ізяслава з Грыгорыем VII. Аднак, што трэба заўважыць, выклікаюць сумневы некаторыя высновы. Аўтар вельмі смела называе папу «заснавальнікам каралеўства Русі-Украіны». Пытанне аб каранацыі Ізяслава альбо яго сына Яраполка далей, чым папскія лісты, на той момант не выйшла [8].

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што Грыгарыянская рэформа Касцёла мела водгук і на ўсходнеславянскіх землях. Карыстаючыся асаблівасцямі папскага дакумента аб надзвычайных паўнамоцтвах рымскага пантыфіка, Ізяслаў Яраславіч спрабаваў вырашыць пытанне аб сваіх правах на кіеўскі прастол. Дыпламатычная перапіска і абмен пасольствамі 1075 г. былі аб’ектам асаблівай увагі гісторыкаў, пачынаючы з XIX ст. і да сучаснасці. На сённяшні момант добра прааналізаваныя пераклады, публікацыі розных гадоў. Але інтэрпэтацыя гэтых падзей па-ранейшаму розная.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Banaszak M.* Historia Kościoła Katolickiego. Warszawa: Akademia Teologii Katolickiej, 1987. T. 2. [Электронный ресурс]. URL: https://portal.tezeusz.pl/cms/tz/fileadmin/user_upload/historа_kosciola_katolickiego.pdf (дата обращения: 10.09.2024).

2. *Лортц Й.* История Церкви (рассмотренная в связи с историей идей). Москва: «Христианская Россия», 1999. [Электронный ресурс]. URL: https://soshestvie-rkcvo.ru/wp-content/uploads/2019/01/Jozef-Lortc-Istoriya-Katolicheskoj-Cerkvi.pdf (дата обращения: 10.08.2024).

3. Григорий VII о папской власти // Средневековье в его памятниках. Под ред. Д. Н. Егорова. Москва: Типо-лит. «Я. Данкин и Я. Хомутов», 1913. С. 98–99.

4. *Рамм Б. Я.* Папство и Русь в X–XV вв. М.–Л.: АН СССР, 1959. 282 с.

5. *Назаренко А. В.* Древняя Русь на международных путях: Междисциплинарные очерки культурных, торговых, политических связей IX–XII вв. М.: Языки русской культуры, 2001.

6. Documenta Pontificum Romanorum Historiam Ucrainae llustrantia v. 1 (1075–1700) / A. Welykyj. Romae: Analecta OSBM, 1953. [Электронный ресурс]. URL: https://diasporiana.org.ua/wp-content/uploads/books/23795/file.pdf (дата обращения: 02.09.2024).

7. Документы о взаимоотношениях папской курии с великим киевским князем Изяславом Ярославичем и польским князем Болеславом II Смелым // Вестник МГУ. Серия VIII. История, № 5. 1975. [Электронный ресурс]. URL: http://yakov.works/acts/11/3/1075bull.html (дата обращения: 20.08.2024).

8. *Ідзьо В.* Святий Папа Римський Григорій VII — засновник Королівства Руси-України в XI столітті. Наукове видання. Івано-Франківськ: «СІМИК», 2018. [Электронный ресурс]. URL: https://s.siteapi.org/2761d2619889a45.ua/docs/ds7lvuuxum0w80sc4ggcws0k0s0kww (дата обращения: 05.09.2024).